**Н. М. Борсук** (Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Брэст)

**КАНЦЭПТ “ДАРОГА” Ў ТВОРЧАСЦІ М. АЛЯХНОВІЧА**

Жыццё, як вядома, ходзіць кругамі, і да таго часу, пакуль гэты круг не выпрастаецца, жыццё не затухне. За новым кругам – новы круг, новая дарога. “На свеце ўсё мае сваю дарогу, асвечаную і асветленую радасцю

жыццяˮ [1, с. 2], – піша М. Аляхновіч. Пра гэта змест паэтычнага зборніка “Святло дарогіˮ (2010) берасцейскага паэта.

Галоўны жыццёвы шлях, які наканаваны М. Аляхновічу лёсам і перададзены ў спадчыну ад бацькоў, бярэ свой пачатак у вёсцы Здзітава, дзе “спаконвек карэніцца наш род / у пашаноце крэўнай і нязводнайˮ. Усведамленне гэтага з гадамі абвастрылася: “… там Здзітава – парог усіх дарог – / да Спорава вядзе, на Старамлыны… / Там немаўлят замешвае сам Бог / з над’ясяльдзянскай самай светлай гліныˮ (верш “Ясельдаˮ). Гэты шлях прывёў яго, малога, у сасновы бор, дзе будучы паэт любіў збіраць грыбы, ягады, любавацца гонкім станам сасонак. За лесам было поле, дзе сеялі жыта, садзілі ды капалі бульбу, адтуль прывозіў будучы выкладчык, паэт разам з бацькамі снапы збожжа. Гэта быў шлях у школу, які аўтар зборніка “Святло дарогіˮ дробнымі крокамі перамерваў кожны дзень: у маразы ды снежныя завеі, у вясновую ды восеньскую непагадзь, у дождж да спякоту. Любіў М. Аляхновіч на гэтым шляху азірнуцца, агледзецца: што блізка і што далёка, што з аднаго боку і другога. Усё жыццё паэт з удзячнасцю ўспамінаў сваю дарогу, бачыў на ёй пад старымі дрэвамі малога хлопчыка, у якім пазнаваў сябе, любоўю плаціў свайму шляху: “Адзнака часу – памяць спее / і ўсё часцей мяне вяртае / да сцежак тых, што не паспелі / мяне забыць… іх памятаюˮ (верш “Валішчаˮ).

Вобраз роднай дарогі поўніцца асацыяцыямі: паэт успамінае Ясельду, што “хавае берагі / ў разліве нестрымана-бурным веснімˮ; жаўрукоў, якія “заходзяцца сваім высокім скерцаˮ; дзьмухаўцы, што “спакояць сэрца і лагодзяць вочыˮ; маладзіц, што ткуць прыгожыя тканіны на кроснах; чуе гаворку, адметную для кожнай вёскі, “вякоў крыніцуˮ; дыханне коней, якія з асаблівай асалодай з дрогкае рукі хлапчукоў бяруць хлеб. Берасцейскі паэт не абыходзіць увагаю прымхі.

Моладзь верыла, што ў іх мясцовасці жывуць прыгажуні-русалкі з даўгімі-даўгімі валасамі, але не ў вадзе, а ў жыце. Маладыя людзі лічылі слабакамі тых, хто баяўся ў начны час прайсці праз поле, якое “паланіў жытнёвы коласˮ: “– Яны цыцкатыя такія, / А прыгажуні – пашукаць, / І валасы даўгім-даўгія, / Што не ўтрымае іх рука. / Але ж калі яна пакліча / Цябе, дурноту, да сябе, – / Так заласкоча, заказыча, / Так засмяе і заскубе, / Што ўсё на свеце, нават волю, / Гатовы ты аддаць-прадаць / За міг русалчын, за няволю, / Якое сам не змог спазнацьˮ (верш “Начлежны агоньˮ). Землякі паэта верылі ў розныя прыкметы, у тым ліку і тую, што глядзець на паповыя сані – быць пры смерці (верш “Саніˮ).

Хлеб роднае хаты, хлеб, што выпякала мама, – для М. Аляхновіча гэта шлях таксама. Хто, вёскаю ўзгадаваны, не славіў хлеб? Мастак слова не прысвячае асобныя творы паэтызацыі гэтага вобраза, але трапяткія, пяшчотныя, паважлівыя адносіны лірычнага героя М. Аляхновіча да хлеба

можна адчуць праз асобныя радкі паэтычнага зборніка: "бяруць-цалуюць хлеб-красу"; "і нас у згодзе й ладзе нараджэння / яднае сонца, нібы бохан хлеба" ("Думкі"); "шчыруюць людзі, як чараўнікі, / каб быў і хлеб, і каб было да хлеба" ("Свята красавіка"). Берасцейскі творца не перастае з захапленнем расказваць пра аднавяскоўцаў, бо ўсё лепшае, лічыць Мікалай Мікалаевіч, у яго ад землякоў, "задумна-мудрых, святых", "добрых, шчырых, светлых", побач з якімі "сэрцам шчырасць адчуваеш". Ён гаворыць пра тое, што яго вяскоўцы вастрэй прадчуваюць бяду, чым радасць, "бо на гэтай спрагнелай зямлі / Мелі радасці болей, чым болю" (верш "Сцежка жыцця").

Як бачна, М. Аляхновіч піша Палессе, сваё Палессе, непаўторны, загадкавы край. Як тут не ўзгадаць словы У. Караткевіча, які, будучы ў захапленні ад падарожжа па Прыпяці, сказаў мастаку Г. Вашчанку: "А ці ведаеш, старычок, што тваё Палессе і не Беларусь, і не Украіна, і тым больш не Расія? Гэта – Палессе" [2, с. 66]. Нягледзячы на тое, што паэт жыве ў горадзе, усёй душою, усёй істотаю, нават звонку, застаецца ў вёсцы: "Ды хто ж забудзе смак тае дарогі!? / Яна ў крыві з часоў Адама-Евы – / Наканавана, даравана Богам". Нельга не пагадзіцца з М. Аляхновічам, што ў горадзе слова, асабліва беларускае, творчай асобе чуецца і бачыцца не такім ёмкім, каранёвым. Ён перакананы, што ўдала падабранае ім слова – гэта яскравае сведчанне таго, што вёска жыве. Думаецца, па гэтай прычыне паэт уводзіць у зборнік некалькі чатырохрадкоўяў, у якіх з адценнем іроніі абыгрываюцца новыя словы: пілінг, крэатыўнасць, кілер, кансенсус. М. Аляхновічу ўдалося на старонках паэтычнай кнігі захаваць мелодыку вясковага жыцця. Напрыклад, у вершы "Вяселле" назіраем арыгінальнае выкарыстанне паэтам прыёму алітэрацыі. Паўтарэнне аднолькавага зычнага гука "л" надае вершу асаблівую гукавую выразнасць: "Ліпень ліпне да спіны ліпкай, / з кветам ліпавым ліпне мёд...".

У жыцці кожнага чалавека наступае такі перыяд, калі хочацца асэнсаваць перажытае, зазірнуць у твар самой смерці, а можа, і вечнасці. На старонках паэтычнага зборніка М. Аляхновіча смерць не прысутнічае як знак конавасці для жывога чалавека. Тым не менш, паэтычная кніга прасякнута пытаннямі пра сэнс існавання: "Мы – і пачатак, і працяг. / Мы – забыццё, і мы – надзея. / Мы на дыстанцыі жыцця / мы толькі дробязная дзея" (верш "Думка"). Паэт шукае душэўную раўнавагу, суцяшэнне перад наступствам вечнасці. Л. Талстой казаў, што трэба жыць так, каб не баяцца смерці і не жадаць яе. Калі ёсць боязнь, то гэта страх "исчезнуть совершенно" (М. Лермантаў). У вершы, якім завяршаецца паэтычны зборнік, М. Аляхновіч працягвае вышэйакрэсленую думку: "Каб кожны міг жыцця свайго зямнога / Мы пражылі без страху і трывогі, / Бо і жыццё ў сусвеце – толькі міг, / І ў ім навечна застанёмся мы". Невыпадкова працытаванае чатырохрадкоўе прысвечана ўсім людзям планеты.

У разважаннях М. Аляхновіча нешта ад вясковага, умудронага жыццёвым вопытам чалавека, які здольны прымераць да сябе пэўную сітуацыю, пафіласофстваваць, задаць пытанні сабе і іншым: “Калі і хто душу нам так знявечыў?..” (верш “Пытанне дарогі”); “Няўжо спакон і сапраўды навечна / раскрыжаваны лёсам чалавек!?” (верш “Яшчэ не вечар”); “А што хамут на нас надзелі – / Няўжо ж мы самі вінаваты?” (верш “Пераднавагодняе”); “Хто якою пільнуе нас вартаю, / Што паўсюдна, заўсёдна маўчым?” (верш “Постаці”); “Ды чаму ж мы растрацілі золата, / што трымала нас праз вякі?” (верш “Золата”); “А як сябе ў саміх абараніць, / Калі слабеюць роду карані?!”…

Пагадзіцеся, зборнік “Святло дарогі” насычаны вершамі экзістэнцыйнага зместу. На старонках паэтычнай кнігі берасцейскага творцы выяўляюцца страта чалавекам нейкага здаровага сэнсу існавання, абсурд рэчаіснасці, фальш, вынікі бяздумнай палітыкі (“час не той”, “усюды бруд, і гразь”; “сваркі-звады”; “згрызоты і адчай”; “недагонны час”), адсюль – прыгнечанасць душы лірычнага героя М. Аляхновіча: “… не да вершаў, калі дух галодны, / а сэрца лёдам самым найхалодным / астуджана” (верш “Проза верша”); “Ад нявер’я – душна” (верш Дарога да лета”); “Святло і цень, як ноч і дзень – адзіны. / Я паміж іх у пошуку сябе”; “Як той кароль, я перад светам голы” (верш “Вечар”). М. Аляхновіч перакананы: нельга ўвесь час абсурдна жыць. Аб гэтым нагадваюць і афарыстычныя выслоўі. Некаторыя з іх цалкам успрымаюцца як вершы-парады: “З пагардай і абразаю маўчком / Спажыць свой час, што дадзены ад веку, – / Адно найменне стане з чалавека, / Калі да кону прыйдзе жабраком” (верш “З пагардай і абразаю маўчком”). Дарога ў М. Аляхновіча намалявана найчасцей элегічнымі фарбамі (“цяжкая, у асфальт забраная”). Наўзбоч яе як сімвал пакут паўстаюць крыжы, што нагадваюць пра смерць блізкіх (“і да матулінай хаціны / іду паўз могілкі старыя” – верш “Валішча”), трагічнае мінулае беларусаў (“На дарозе адвечнай – крыжы адно, / і адзнакаю часу – вякі”).

Вершы М. Аляхновіча, на наш погляд, – гэта імпульсы адчуванняў, гэта па сутнасці інтэлектуальна-псіхічны працэс думання, самааналізу. Не дзіўна, што праблема выбару акрэсліваецца ў назвах раздзелаў зборніка (“На мяжы расстання і сустрэчы”), асобных словах (“абрыў-дарога”), паэтычных радках (“Мёд атрутны лагодзіць слых”), назвах вершаў (“На дарозе часу”, “Пытанне дарогі”). Паэт ставіць чытача перад выбарам: “Што лепей: / быць канаваю?” альбо “у самасці сваёй, / жывой, адвечнай, / імгненнем кожным / берагам пярэчыць?” Ён не аддае перавагу нейкаму асобнаму шляху жыцця. Паэт проста канстатуе, што ёсць два ўзроўні жыцця і права кожнага зрабіць выбар, але ж чалавек павінен, па перакананні мастака слова, ведаць і дбаць пра духоўную вышыню.

Невыпадкова М. Аляхновіч частку вершаў выдзяляе ў асобны раздзел "Паклон вясне". Гэта прысвячэнні сябрам, калегам, аднадумцам, з якімі звялі яго жыццёвыя сцежкі-дарожкі. На людзей паэт глядзіць праз прызму маральнага хараства, бо "шлях жыццёвы – незваротны, / які ні ёсць – адзін магчымы" (верш-прысвячэнне Г. Малажай). Побач з такім чалавекам, як Галіна Мікалаеўна Малажай, творца багацеў вопытам, рос, развіваўся. Постаць настаўніцы, калегі вабіць М. Аляхновіча сваёй гуманістычнай сутнасцю. Ні пэўныя грамадскія перамены, ні жыццёвыя метамарфозы не раз'яднaлі яе з людзьмі, не расчаравалі ў аднойчы абранай справе. Яна не пераставала дарыць любоў людзям: "Яна, руплівіца ад Бога, / гарэла кожнаю хвілінай, / ішла абранаю дарогай, / сваю ратуючы Айчыну. / Прымала з ціхаю пакорай / удары лёсу і – мацнела. / Трывала, верыла, што скора / ўсё будзе так, як і хацела". М. Аляхновіч верыць, калі на шляху моладзі будуць сустракацца настаўнікі (вершы-прысвячэнні З. Мельнікавай, У. Лебедзеву, Л. Леванцэвіч, А. Макарэвічу і інш.), якія сваімі справамі здолеюць абудзіць у свядомасці маладых людзей разуменне таго, што беларускі народ несмяротны і на прахлай зямлі не згібее, нашы нашчадкі павернуцца тварам да Айчыны дзеля новае вясны.

На старонках зборніка цесна пераплятаюцца два матывы: духоўнага ўдасканалення асобы і адраджэння роднай Беларусі. Гэтая думка выразна прасочваецца ў вершы "Дарога да сябе", у якасці эпіграфа да якога М. Аляхновіч выкарыстаў словы з Н. Гілевіча: "О, як далёка нам яшчэ / да Беларусі…". Чалавечай мужнасці герояў зборніка "Святло дарогі" не замінае пяшчота, добразычлівасць, радасці і засмучэнні. Ці не таму саюзніцай для іх з'яўляецца лагодная прырода з яе воблакамі, вятрамі, сонцам залатым, вятрамі, крынічнаю вадою… Адсюль светлыя, азораныя вясновай чысцінёй назвы вершаў: "Шчыраванец", "Сонца верасня", "Свята красавіка", "Дарога даверу" і інш.

Вершы пра долю чалавека ("Сонечны жнівень", "Шчыраванец"), пра тое самаахвярнае, святое ў людзях, што гоіць сэрца і душу іншым людзям ("За годам год, за хваляй хваля", "У дзень Святой Ганны", "Дарога даверу"), пра непарыўны дар сяброўства ("Свята красавіка"), пра чалавечую прыгажосць духоўную і вонкавую ("Фарбы лета", "Пачаў з сярэдзіны стагоддзя") кранаюць глыбінным лірызмам. Нягледзячы на тое, што некаторыя паэтычныя творы прысвечаны дарагім людзям, якія адышлі ў вечнасць, у іх радках не заўважаецца мінорная інтанацыя. У раздзеле "Паклон вясне" хораша адбіўся стан душы М. Аляхновіча. Яго вершы – гэта не дэкларaванне з нагоды юбілею калегі, сябра, гэта стан душы паэта – выказаць павагу да чалавека.

Цяжка крочыць па жыццёвых дарогах без любові, надзейных сяброў, але яшчэ складаней, асабліва творчым асобам, без кахання. Гэтая думка паэтам ёміста ўвасоблена ў метафарычным выслоўі: "сцежка жыцця – на дваіх". На гэтым шляху ў лірычнага героя фарміруецца здольнасць бачыць, ацэньваць жыццёвую дарогу як рэальнасць жывую, дзе мерай рэчаў з'яўляецца чалавек, яго шчасце: "І горача, і холадна – да слёз, / але яднае нашы сэрцы згода" (верш "Дарога снегу"); "Так хораша пачуць: / Дзень добры, мілы! / Так шчасна мовіць: / – Любая мая..." (верш "Падкова"); "Ты – мая песня. / Ты – маё сонца" (верш "Вясна"). І гэта нягледзячы на тое, што такія ўніверсальныя катэгорыі, як любоў і нянавісць, ласка і грубасць, вызначаюць якасці быцця ("прэч адкідаем тую пустку, / што нашы развяла дарогі"; "няма мяжы – пераарана" – верш "Спакуса"). Ці не таму М. Аляхновіч уводзіць у паэтычны зборнік незвычайны варыянт калыханкі ("Агу"), якую спявае мужчына сваёй каханай: "Магу ці не магу... / Агу... / Прашу і сонца я, і неба: / у дні мае прыйдзі як-небудзь, / у сны прыйдзі, што берагу. / Магу ці не магу... / Агу...". Словы з верша-песні сведчаць, што на паэтычным небасхіле Берасця шчыруе паэт з надзвычай пяшчотным сэрцам і вытанчаным эстэтычным густам.

Паэтычнай манеры М. Аляхновіча характэрна традыцыйна-рэлігійная і ўласна-царкоўная свядомасць: "Тут з Грамніцамі – там з Купалаю; / там Вялікдзень, тут – цені Дзядоў. / Сам Бог ведае: многа ці мала нам / да свайго ўразумення гадоў" (верш "Дарога да сябе"). Па-першае, гэта тлумачыцца тым, што заходнікі не зазналі такога грунтоўнага выкаранення рэлігійнай свядомасці, па-другое, увесь час на нашай зямлі супастаўляліся праваслаўная і каталіцкая рэлігіі. Каталіцкая ўспрымалася як элітарная, праваслаўе ж было для людзей простых. Невыпадкова герой зборніка звяртаецца то да Бога, які прызнаны ў хрысціянстве адзіным, усемагутным ("Святым мясцінам пакланіцца / Наканаванасць ці то лёс, / Каб хоць часцінкай прычасціцца / Да чыстай глыбіні нябёс"), то да багоў паганскага пантэона, як увасаблення героіка-рамантычнага мінулага народа ("Агонь паганскі ўспалымню як трэба / І, як язычнік, усхвалю Дажбога: / Няхай заўсёды нас пад гэтым небам / Адзіная вядзе ў жыцці дарога!").

Да асэнсавання разглядаемага вобраза звярталіся М. Танк, А. Разанаў, Я. Колас, які прызнаны песняром беларускіх дарог, Р. Барадулін і інш. Як сведчыць зборнік "Святло дарогі" М. Аляхновіча, гэты вобраз-канцэпт становіцца дамінантным, ідэйна-тэматычным у лірыцы берасцейскага творцы. Толькі ў названай паэтычнай кнізе ён ужываецца 27 разоў і налічваецца 8 вершаў на тэму дарогі. Безумоўна, з жыццёвымі сцежкамі, шляхамі, дарогамі звязаны матыў руху і вандраванняў чалавека ("Час пад коламі – дарогай" – верш

“Сасновы бор”). Але ў М. Аляхновіча дарога перш-наперш з’яўляецца паказчыкам духоўнага сталення героя, сімвалам яднання лірычнага героя з бацькоўскім парогам, родным Палессем, домам бацькоў, каханай жанчынай, сябрамі, калегамі, аднадумцамі; яна вядзе ў вечнасць, да неба, да Бога: “Чытаем, слухаем нанова / І разумеем слова – Бог”.

**Літаратура**

1. Аляхновіч, М. Святло дарогі : вершы / М. Аляхновіч. – Брэст : Альтернатива, 2010. – 98 с.
2. Карамазаў, В. Брама : аповесць / В. Карамазаў. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 128 с.